**САВЕТ МІНІСТРАЎ**
**РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**СОВЕТ МИНИСТРОВ**
**РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

ПАСТАНОВА

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

31 кастрычніка 2025 г. № 598

г. Мінск

г. Минск

Аб правядзенні навагодніх дабрачынных акцый ”Нашы дзеці“ і ”Ад усёй душы“

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Штогод праводзіць навагоднія дабрачынныя акцыі з удзелам рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, іншых арганізацый, падпарадкаваных Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў у мэтах віншавання дзяцей і пажылых грамадзян з Новым годам, Нараджэннем Хрыстовым, уручэння ім падарункаў, аказання дапамогі ў вырашэнні існуючых праблем у адпаведнасці з заканадаўствам:

”Нашы дзеці“ – з 15 снежня па 14 студзеня;

”Ад усёй душы“ – з 23 снежня па 14 студзеня.

2. Фінансаванне расходаў на правядзенне акцыі ”Нашы дзеці“ ажыццяўляецца за кошт сродкаў, прадугледжаных у рэспубліканскім бюджэце Міністэрству культуры і Міністэрству адукацыі на правядзенне цэнтралізаваных культурных, адукацыйных і іншых мерапрыемстваў, а таксама пазабюджэтных сродкаў, эканоміі каштарыса расходаў і сродкаў з іншых крыніц, якія не забаронены заканадаўствам.

Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы ажыццяўляюць фінансаванне акцыі за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў, пазабюджэтных сродкаў і сродкаў з іншых крыніц, якія не забаронены заканадаўствам.

3. Фінансаванне расходаў на правядзенне акцыі ”Ад усёй душы“ ажыццяўляецца за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, прадугледжаных Міністэрству культуры на правядзенне цэнтралізаваных культурных мерапрыемстваў, мясцовых бюджэтаў у адпаведнасці з заканадаўствам, а таксама пазабюджэтных сродкаў і сродкаў з іншых крыніц, якія не забаронены заканадаўствам.

4. Дадзеная пастанова ўступае ў сілу пасля яе афіцыйнага апублікавання.

Прэм’ер-міністр
Рэспублікі Беларусь А.Турчын